МІЖНАРОДНАЕ ГРАМАДСКАЕ АБ'ЯДНАННЕ "ЗГУРТАВАННЕ БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ "БАЦЬКАЎШЧЫНА"

№5 (76)
травень
2008

# БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ

## У НУМАРЫ:

### КУПАЛЬСКАЯ КВЕТКА РАСПУСЦІЦЦА Ў ІРКУЦКУ

Галоўным святам, вядома, будзе Купальская ноч, на другое месца па значнасці мерапрыемстваў можна паставіць абранне галоўнай гераіні свята – Купалінкі. Да ўдзелу ў конкурсе арганізатары запрашаюць усіх жадаючых незамужніх дзяўчат ва ўзросце ад 18 да 30 год.

*Працяг на стар. 2*

### АЛЯКСЕЮ МАРАЧКІНУ ЗНОЎ ПАГРАЖАЕ АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

"Гэта смех на ўвесь свет! Прыцягваць да адказнасці за карціну, якая выстаўлялася ў Палацы мастацтва – гэта проста абсурдна. Выява гэтай карціны друкавалася ў многіх газетах і раней нараканняў ні ў кога не выклікала, а вось зараз вырашылі прычапіцца менавіта да яе…"

*Працяг на стар. 3*

### ЯГОНАЯ МІЛАСЦЬ ЕПІСКАП НАВАГРАДСКІ І ПАЎНОЧНА-АМЕРЫКАНСКІ СВЯТАСЛАЎ

*Працяг на стар. 7*

### ПЕРАМОЖЦА КОНКУРСУ "АДЗІН ДЗЕНЬ У БНР"

"Радыё Свабода" падвяло вынікі літаратурнага конкурсу "Адзін дзень у БНР-2008". Умовай конкурсу было стварэнне тэксту адвольнага жанру, які б апісваў жыццё ў Беларускай Народнай Рэспубліцы ў часы адзначэння яе 90-годдзя.

*Працяг на стар. 8*

### ПАЙШЛІ З ЖЫЦЦЯ СЯБРЫ "БАЦЬКАЎШЧЫНЫ"

*Працяг на стар. 5*

# "Гісторыя Беларусі" знікне са школьнай праграмы?




Гэта чарговы лагічны крок пасля таго, як прадмет пачалі выкладаць па-руску.

Курс "Гісторыя Беларусі" ў нашых школах выкладацца больш не будзе. У праекце вучэбнага плана на наступны год напісана проста – "гісторыя". Для новага прадмета рыхтуецца і адмысловы падручнік.

Такую інфармацыю пацвердзіла "Еўрарадыё" намесніца начальніка ўпраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Валянціна Маеўская. Па словах чыноўніцы, цяпер працуе міжведамасная камісія, якая абмяркоўвае пытанне пра аб'яднанне двух прадметаў з новага навучальнага года: "Адно з пытанняў – гэта зацвярджэнне вучэбнага плана, у якім гэты прадмет будзе называцца "Гісторыя". Ён будзе складацца з двух частак. І выдзяляецца дзве гадзіны. Адна гадзіна на гісторыю Беларусі, другая – на сусветную гісторыю. І так, як было, так і застаецца. Проста ў вучэбным плане ён будзе называцца "Гісторыя".

Новы вучэбны план стане дадаткам да Дэкрэту аб пераходзе на 11-гадовы тэрмін навучання ў школах. Пра гэта "Еўрарадыё" расказаў старшыня Камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Здановіч. План "задавальняе ўсіх". А колькі дакладна гадзінаў будзе адведзена на гісторыю Беларусі ў агульным курсе гісторыі, У. Здановіч не ведае: "Я не ведаю, тут проста напісана "гісторыя", таму тут я не магу растлумачыць, ці то будзе гісторыя сярэдніх вякоў… і колькі гадзінаў на гісторыю Беларусі. Проста напісана слова "гісторыя". У прынцыпе, калі мы ўчора абмяркоўвалі план, то ён задаволіў усіх".

Закрануць змены нават старэйшыя класы, якія ў сувязі з пераходам на 11-годку школу будуць заканчваць у "экстрэмальных умовах".

У. Здановіч: "Нават у пераходным тыповым вучэбным плане для

*Працяг на стар. 8*

# Купальская кветка распусціцца ў Іркуцку



З 17 траўня па 14 чэрвеня "Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага" праводзіць шэраг трэнінгаў па падрыхтоўцы асноўнага беларускага народнага свята "Купалле-2008". Гэта мерапрыемства праводзіцца ў межах праграмы "Народны каляндар". Такім чынам беларусы Іркуцка спадзяюцца зацікавіць мясцовую моладзь у вывучэнні традыцыйных народных формаў побыту, у адраджэнні і арганізацыі старажытных народных абрадаў.

Сярод запланаваных мерапрыемстваў:

17 траўня – майстар-клас "Асаблівасці беларускага нацыянальнага абрадавага строю: тэорыя і практыка".

24 траўня – майстар-клас "Беларуская традыцыйнага абрадавая вышыванка".

31 траўня – трэнінг-конкурс "Купалінка-2008", на якім пройдзе навучанне моладзі абрадавым гульням, танцам, карагодам, а таксама будзе абрана галоўная гераіня свята – "Купалінка-2008".

7 чэрвеня – трэнінг-гульня "Русалкі – харэаграфічная пастаноўка".

14 чэрвеня – трэнінг "Купальская ноч – гісторыя, традыцыя і практычная арганізацыя тэатралізаваных кампазіцый".

І хаця галоўным святам, вядома, будзе Купальская ноч, на другое месца па значнасці мерапрыемстваў можна паставіць абранне галоўнай гераіні свята – Купалінкі. Да ўдзелу ў конкурсе арганізатары запрашаюць усіх жадаючых незамужніх дзяўчат ва ўзросце ад 18 да 30 год (так патрабуе беларускі абрад).

Канкурсанткі павінны валодаць хаця б мінімальнымі ведамі пра старажытнабеларускі абрад "Купалле" (а гэта можна знайсці ў кніжках і, у прыватнасці, кніжцы іркуцкага беларуса Алега Рудакова "Беларускія абрадныя святы"). Журы пацікавіцца ў канкурсантак, як яны ўяўляюць сабе вобраз Купалінкі, паглядзяць, наколькі яны могуць арганізаваць беларускую нацыянальную гульню, беларускі пабытовы танец (паўтарыць за мадэратарам конкурсу рухі танца). Менавіта з лепшых абяруць Купалінку 2008 года.

Вынікам усёй дзейнасці па падрыхтоўцы беларускага свята стане Купальская ноч, якая будзе зладжана Таварыствам у ноч з 21 на 22 чэрвеня на берагу ракі Ангара.

Алег Рудакоў распавёў Інфармацыйнаму цэнтру МГА "ЗБС "Бацькаўшчына" пра падрыхтоўку да Купалля: "Мы праводзім гэта свята 13 год запар, і заўсёды збіраецца шмат людзей, якія цікавяцца народнымі традыцыямі. Таварыства трымае цікавасць людзей напрацягу ўсёй начы, бо кожную гадзіну штосьці адбываецца – ці то гульні, ці то карагоды, ці то конкурсы. А ўвогуле гэта не адзінае свята, якое мы ладзім. Штогадова праводзім Каляды, Гуканне вясны, Купалле, Дзяды. Але акрамя іх праводзяцца таксама і розныя іншыя святкаванні, так, напрыклад, выязджалі за 180 км ад Іркуцка і там праводзілі ў мінулым годзе "Дажынкі", праводзілі таксама святы "Пахавання стралы", "Жаніцьба Цярэшкі" ды інш."

*Інфармацыйны цэнтр МГА "ЗБС "Бацькаўшчына"*

## НЬЮ-ЁРК (ЗША)

**6 траўня ў Фундацыі Крэчаўскага прайшла сустрэча з землякамі,** што правялі тры тыдні ў ЗША па праграме "Гармонія" (валанцёрскі досвед і праца). Сустрэча прайшла цікава і змястоўна, у нязмушанай атмасферы абмяняліся навінамі, знайшліся агульныя знаёмыя. Перад прысутнымі выступіў паэт і бард Сяржук Сокалаў-Воюш.

*Паводле БАЗА*

***

**Хіратанізацыя ў епіскапскую годнасць а. архімандрыта Святаслава (Вячаслаў Логін).** Хіратанізацыя адбылася 11 траўня 2008 г. у Кафедральным Саборы св. Кірылы Тураўскага ў Брукліне. Абрад хіратоніі быў выкананы Архіепіскапам Уманскім і Дэтройцкім Аляксандрам, Епіскапам Барыспальскім Паісіям ды Епіскапам Х'юстанскім і Тэксаскім Макарыюсам у асысце святарства і пры ўдзеле вялікай колькасці вернікаў з Нью-Ёрка, Нью-Джэрсі і Канады.

*Паводле БАПЦ*

***

**23 траўня ў Фундацыі Крэчаўскага адбылася сустрэча з Пятром Рудкоўскім**, выкладчыкам Цэнтра беларускіх даследаванняў (Center of Belarusian Studies) у Канзасе. Тэма сустрэчы – дзейнасць Цэнтра беларускіх даследаванняў.

*Паводле "Згуртавання беларускай моладзі ў Амерыцы"*

## БЕЙРУТ (ЛІВАН)

**Беларускія грамадзяне звярнуліся па дапамогу ў расійскую амбасаду.** Міністэрства замежных спраў Беларусі сочыць за сітуацыяй у Бейруце і знаходзіцца ў сталым кантакце з пасольствамі Расіі і Украіны ў Ліванскай Рэспубліцы. Як паведаміў БелаПАН дзяжурны МЗС, інфармацыі ад грамадзян Беларусі, што жадаюць выехаць з гэтай краіны, пакуль не паступала. Ён дадаў, што Беларусь не мае сваё амбасады ў Ліване; самае блізкае беларускае дыпламатычнае прадстаўніцтва знаходзіцца ў Сірыі.

*Паводле БелаПАН*

## ВІЛЬНЯ (ЛІТВА)

**7 траўня адбылася прэзентацыя кнігі Уладзіміра Арлова "Імёны Свабоды".** У сустрэчы пісьменніка

з чытачамі, браў удзел і літоўскі паэт Карнеліус Платэліс.

***

**“Малітва да Вільні” гучала 17 траўня каля Вострай Брамы.** А 7 вечара на беларускай мове да горада Вільні гучала малітва, словы якой падобныя на “Ойча наш”.

“Горад наш, які ёсць у нябёсах, нябёсы якога ёсць памяць пра пакутнікаў, творцаў, герояў: Антоні, Астах, Іаан, Скарына Францішак, Каліноўскі Кастусь, ксёндз Станкевіч Адам, і Луцкевічы, і Аляхновіч…

Горад наш, які ёсць на зямлі, а зямлёю якога ёсць мы; хто належыць табе і цябе сатварае, табою сатвораны будзе.

Дай нам мудрасці, Горад, каб вызначыць межы і месца сваё беларускае роўна з табою, на адлегласці мары прасветлай.

Дай нам голасу чыстага, славіць імя тваё, Горад, тут, цяпер, і далёка, і блізка, і заўтра, і потым, і вечна,

Вільня”.

*Паводле інтэрнэт-газеты Паазер’я і Віленшчыны vestki.info*

***

**15 траўня ў ЕГУ адбылася сустрэча з паэтам Сяргеем Законнікавым.** Гутарка адразу пайшла пра самае галоўнае – пра мову. Але, вядома, падчас гутаркі закранулі розныя тэмы: пра сённяшнюю бездухоўнасць, і пра Чарнобыль (С.Законнікава папрасілі прачытаць урывак з паэмы “Чорная быль”), і пра Вільню, пра тое, што мы павінны памятаць і берагчы той “віленскі перыяд”, які быў у нашай культуры. Гаварылі і пра жанчын, пра каханне. Сяргей Законнікаў прэзентаваў сваю кнігу вершаў “Першы пацалунак” і расказаў, што з’яўленне яе сталася магчымым дзякуючы дапамозе дарагіх яму жанчын: жонка падтрымала матэрыяльна, а дачка Алена займалася афармленнем кнігі (на вокладцы – яе дзявочая каса, якую Алена адрэзала, калі выходзіла замуж).

*Паводле газеты “Свабода”*

***

**Клуб “Сябрына” адзначае 20-годдзе.** Гэта першая беларуская грамадская арганізацыя ў паваеннай Літве. Юбілей урачыста адзначаўся 24 траўня ў віленскай гарадской ратушы. Клуб беларускай культуры “Сябрына” з’явіўся ў Вільні напрыканцы траўня 1988 года з ініцыятывы літоўскага аматара беларушчыны, вядомага ў Літве эсперантыста Валдаса Банайціса і маладых мясцовых беларусаў разам з тымі старэйшымі беларусамі, якія жылі ў той час у Вільні – дзяячкі нашаніўскай пары Зоські Верас, выпускнікоў Віленскай беларускай гімназіі, прадстаўнікоў старой віленскай беларускай інтэлігенцыі.

*Паводле “Радыё Свабода”*

## МЮНСТЭР (НЯМЕЧЧЫНА)

**Прайшла акцыя салідарнасці з ахвярамі рэпрэсій у Беларусі.** Акцыя адбылася 16 траўня ў цэнтры горада каля гарадской ратушы. Удзельнікі пікета, грамадзяне Беларусі, Германіі, Польшчы, Румыніі, трымалі ў руках плакаты, на якіх было напісана на нямецкай мове: “Беларусі патрэбна еўрапейская салідарнасць” і “Разам мы зможам зрабіць Беларусь свабоднай”. Былі разгорнуты партрэты беларускіх палітзняволеных: экс-кандыдата ў прэзідэнты лідэра Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Аляксандра Казуліна, актывістаў апазіцыі Андрэя Кіма і Сяргея Парсюкевіча, а таксама зніклых вядомых людзей у Беларусі — Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і журналіста Дзмітрыя Завадскага. З чырвоных і белых свечак актывісты выклалі бела-чырвона-белы сцяг і лічбу 16.

*Паводле сайта “Мы памятаем”*

## ГААГА (НІДЭРЛАНДЫ)

**16 траўня прайшоў Дзень салідарнасці** з ахвярамі таталітарнага рэжыму ў Беларусі. Акцыя арганізавана галандскай студэнцкай арганізацыяй “Mission to Minsk” сумесна з грамадзянскай ініцыятывай “Мы памятаем”. Акцыя праходзіла традыцыйна каля беларускай амбасады ў Нідэрландах.

*Паводле сайта “Мы памятаем”*

## БЕЛАСТОК (ПОЛЬШЧА)

**Алег Латышонак і Яўген Вапа атрымалі высокія ўзнагароды.** Ім былі ўручаны Кавалерскія крыжы Ордэна Адраджэння Польшчы. Гісторык А. Латышонак і старшыня Беларускага саюза ў Польшчы Я. Вапа атрымалі ўзнагароды ў Варшаве з рук польскага прэзідэнта Леха Качыньскага. Беларусы былі адзінай нацыянальнай меншасцю ў Польшчы, якая мела сваё падполле і ў 1980-я гады мінулага стагоддзя ўдзельнічала ў змаганні за дэмакратыю.

*Паводле сайта “За свабоду!”*

## ВАРШАВА (ПОЛЬШЧА)

**БНП ушанавала памяць загінулых беларусаў.** 6 траўня сябры Беларускай Нацыянальнай Памяці (БНП) ушанавалі памерлых і загінулых беларусаў. Тых, хто па волі лёсу апынуўся на чужыне. У Варшаве ўшанавана памяць Марыі Ямант, Яна Булгака, Яна Жамойціна, а. Мітрафана Будзькі, а. Вячаслава Аношкі, Якуба Ясінскага, Тадэвуша Корсака, Станіслава Булак-Балаховіча. У Кракаве сябры БНП наведалі магілу Алеся Гаруна. Вечная слава і памяць героям!

*Паводле БНП*

## ГДАНЬСК (ПОЛЬШЧА)

**Станіслаў Шушкевіч узнагароджаны “Голубам міру”.** Узнагарода ўручаецца за заслугі ў барацьбе за мір і правы чалавека. Яна была заснаваная з нагоды 60-годдзя прыняцця Дэкларацыі правоў чалавека. Прэмію С. Шушкевічу ўручыў былы прэзідэнт Польшчы і старшыня легендарнага прафсаюзу “Салідарнасць”, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Лех Валенса. Ранейшымі лаўрэатамі “Голуба міру” з’яўляюцца, у прыватнасці, Лех Валенса, былы прэзідэнт Чэхіі Вацлаў Гавел ды былы прэм’ер-міністр Польшчы Ежы Бузэк.

*Паводле “Польскага радыё для замежжа”*

## ШТУТГОФЕ (ПОЛЬШЧА)

**У былым канцэнтрацыйным лагеры Штутгоф будзе ўсталяваная дошка ў памяць беларусаў, якія загінулі ў ім.** Пра гэта “Польскаму радыё” паведаміў Генеральны консул Беларусі ў Гданьску Руслан Есін. Паводле дыпламата, з ініцыятывай усталявання мемарыяльнай дошкі выступіла консульская ўстанова. Рада Дзяржаўнага музея Штутгоф падтрымала ініцыятыву беларускага боку. У выніку сумеснай працы ўдалося ўстанавіць прозвішчы 1002 беларусаў, што загінулі ў фашысцкіх засценках. Канцэнтрацыйны лагер Штутгоф гітлераўцы стварылі 2 верасня 1939 г. – на наступны дзень пасля пачатку Другой сусветнай вайны. Лагер размяшчаўся ў 30 км ад Гданьска. Нацысты закатавалі альбо забілі ў лагеры каля 130 тыс. чалавек, якія паходзілі з 26 краін. Вязні лагеру былі вызваленыя

*Працяг на стар. 4*

## ШТУТГОФЕ (ПОЛЬШЧА)

*Працяг. Пачатак на стар. 3*

войскамі Другога беларускага фронту 9 траўня 1945 г.

*Паводле “Польскага радыё для замежжа”*

## ІРКУЦК (РАСІЯ)

**У Іркуцку абрана новае кіраўніцтва таварыства.** Так, 22 сакавіка прайшоў IV агульнагарадскі сход Іркуцкага аддзялення Рэгіянальнай грамадскай арганізацыі “Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага” (ІТБМ). І хаця праца папярэдняга склада кіраўніцтва была прызнана задавальняючай, быў абраны новы склад кіраўніцтва гарадской Рады на чале з Аленай Сіпаковай.

А 26 красавіка адбыўся VIII З’езд Рэгіянальнага грамадскага аб’яднання “Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага”. У з’ездзе прынялі ўдзел 75 дэлегатаў і 99 гасцей. Па выніках справаздачнага з’езда старшынёй таварыства зноў абраны Алег Рудакоў, намеснікамі – Уладзімір Якавенка і Алена Сіпакова. З’езд абраў сябраў абласной Рады і Рэвізійную камісію. Акрамя выбарчай часткі на з’ездзе была зацверджана “Праграма дзейнасці Таварыства на 2008–2009 гг.”

*Паводле ІТБМ*

## МАСКВА (РАСІЯ)

**Беларускае зямляцтва ў Маскве правяло кінафестываль, прымеркаваны да Дня Перамогі.** Так, з 26 па 30 красавіка ў Маскоўскім дзяржаўным інстытуце міжнародных стасункаў Міністэрства замежных спраў Расійскай Федэрацыі (МДІМС МЗС РФ) адбыўся першы штогадовы кінафестываль, прысвечаны Дню Перамогі. Ягоным ініцыятарам выступіла беларускае зямляцтва МДІМС, а арганізатарам – нядаўна створаная Рада зямляцтваў МДІМС. Асноўны слоган кінафестывалю – “Абыякавасць – злачынная”. У рамках кінафестывалю кожнае з зямляцтваў-удзельнікаў прадставіла па адным вядомым у свеце фільме. Кожны фільм распавядаў пра падзеі ў канкрэтнай краіне, звязаныя з той нацыяй, якую прадстаўляе зямляцтва. Былі прадэманстраваныя стужкі “Мой фюрер” (нямецкае зямляцтва), “Ідзі і глядзі” (беларускае зямляцтва), “Бацька салдата” (грузінскае зямляцтва) і “Фальшываманетчыкі” (ізраільскае зямляцтва).

*Кіраўніцтва Беларускага зямляцтва МДІМС*

***

**7 траўня адбыўся канцэрт нацыянальнасцяў у Маскве.** У Канферэнц-зале МДІМС МЗС РФ адбыўся вялікі канцэрт нацыянальнасцяў інстытута, арганізаваны Радай зямляцтваў МДІМС сумесна са Студэнцкім звязам. У канцэрце з дапамогай зямляцтваў узялі ўдзел прадстаўнікі Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Нямеччыны, Грузіі, Ізраіля, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Славакіі, Таджыкістана, Узбекістана, Украіны ды Францыі. Ад Беларусі на сцэне Канферэнц-залы МДІМС выступілі ўдзельнікі гурту “Testamentum terrae” – вядомыя беларускія музыкі Юрась Панкевіч і Віталь Касавец, якія прэзентавалі сярэднявечную музыку Вялікага княства Літоўскага з дапамогаю беларускай дуды ды турэцкага барабана.

*Паводле сайта “Беларуская Масква”*

***

**16 траўня каля будынку Беларускай амбасады прайшоў пікет салідарнасці з беларускімі палітзняволенымі.** У пікеце прынялі ўдзел актывісты руху “Абарона”, “Мы”, “Свабодныя радыкалы”, а таксама АГФ. Удзельнікі скандзіравалі: “Жыве, Беларусь!”, “Беларусі свабоду, Расіі свабоду!” і інш. Трымалі расцяжкі “Свабоду палітзняволеным”.

*Паводле сайта “Мы памятаем”*

***

**17 траўня у МДІМС МЗС РФ прайшоў Кубак садружнасцяў па міні-футболе.** Удзельнічалі каманды Азербайджана, Арменіі, Кыргызстана, Узбекістана, Казахстана, Таджыкістана, Украіны, Беларусі, Расіі, Грузіі, Вугоршчыны, Ізраіля, а таксама зборная Азіі і зборная Еўразвязу. Кожная прайграўшая каманда адразу выбывала з турніру. Беларуская каманда гуляла з камандай Таджыкістана, Кыргызстана; у паўфінале яна ўступіла камандзе Расіі 2-0, а ў гульні за трэцяе месца перайграла каманду Казахстана 1-0, стаўшы адной з лепшых. Пераможцы турніру: зборныя Расіі (1 месца), Грузіі (2 месца), Беларусі (3 месца).

*Паводле сайта “Беларуская Масква”*

***

**20 траўня ў Маскоўскім доме нацыянальнасцяў адбылася канферэнцыя “Ідэнтычнасць беларусаў: сучаснае вымярэнне”**, арганізаваная Саветам РНКА “Беларусы Масквы”. У мерапрыемстве прынялі ўдзел кіраўніцтва Камітэта міжрэгіянальных сувязяў і нацыянальнай палітыкі Масквы і Маскоўскага Дома нацыянальнасцяў, выкладчыкі гістарычнага факультэта МДУ імя М.В. Ламаносава, навукоўцы Расійскай акадэміі навук у галіне гісторыі і этнаграфіі, актыў РНКА “Беларусы Масквы”, кіраўніцтва нацыянальных аўтаномій Масквы, Маскоўскае тэлебачанне. Сярод тэм, якія гучалі на канферэнцыі: “Тэма “маскаля” ў беларускай літаратурнай класіцы”, “Культурна-псіхалагічныя асаблівасці беларускай нацыі ў рэчышчы тэхнічных геаэканамічных задач”, “Беларусь паміж Расіяй і Еўропай: выбар ідэнтычнасці” і інш.

У другой частцы канферэнцыі госці азнаёміліся з багаццем і гармоніяй беларускай культуры на прыкладзе нацыянальных касцюмаў XIX ст. Беларусі і народных песняў у выкананні кіраўніка фальклорнага ансамбля “Кірмаш” І.Г. Капчынскай. Акрамя таго, рэстаран пры Амбасадзе Беларусі ў Расіі прыгатаваў для дэгустацыі стравы беларускай кухні, якія не пакінулі нікога абыякавым. Пры тым каля кожнай стравы быў пазначаны яе склад і рэцэпт прыгатавання.

У межах мерапрыемства была арганізавана экспазіцыя беларускіх сувеніраў, касметыкі і прадукцыі з ільну.

*Паводле сайта “Беларусы Масквы” (www.belmos.ru)*



*Канферэнцыя “Ідэнтычнасць беларусаў: сучаснае вымярэнне” (Масква, Расія)*

# Анатоль Кірвель (1939–2008)

8 траўня ў Мінску на 69-ым годзе жыцця пайшоў у лепшы свет Анатоль Кірвель, пісьменнік, эсэіст, сябра ЗБС "Бацькаўшчына", Саюза беларускіх пісьменнікаў. Пахаванне адбылося 12 траўня на могілках вёскі Тарасава, што пад Мінскам.

А. Кірвель нарадзіўся 23 ліпеня 1939 г. у вёсцы Вітуніцы Докшыцкага раёна, доўгі час жыў у Санкт-Пецярбурзе. Быў адным з рэдактараў незалежнай газеты пецярбургскіх беларусаў "Родзічы". І ў Расіі працягваў пісаць на роднай мове, кантактаваў з беларускай дыяспарай. "Піцерскія эцюды" пісьменніка друкаваліся ў часопісе "Дзеяслоў", пастаянным аўтарам якога А. Кірвель з'яўляўся. Мастацкія творы пачаў друкаваць напрыканцы шасцідзесятых гадоў; выдаў кнігі прозы "Човен Харона", "Мармуровы воўк", "Мёртвы горад", "Ласінае крэда", паэтычны зборнік "Урбанія".

*Управа МГА*
*"ЗБС "Бацькаўшчына"*

# Альберт Мітэр (1934 –2008)

15 сакавіка на 74-ым годзе жыцця памёр Альберт Мітэр, сябра Сібірскага таварыства беларускай культуры, сябра Вялікай Рады ЗБС "Бацькаўшчына".

А. Мітэр з'яўляўся адным з заснавальнікаў фармалізаванага беларускага руху. Вельмі шмат часу прысвячаў вывучэнню і прапагандзе культуры, наладжванню сувязяў паміж Беларуссю і Сібір'ю, цікавіўся генеалогіяй выхадцаў з Беларусі. У 2006 г. А. Мітэр звяртаўся ў гарадскую камісію па перайменаванні Новасібірска з прапановамі надаць адной з вуліц ці бібліятэк імя вядомага беларускага першадрукара Францыска Скарыны.

Старшыня праўлення Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра імя св. Ефрасінні Полацкай Іван Панасюк зазначыў: "Альберт Антонавіч быў сапраўдным патрыётам Беларусі, любіў сваю радзіму і да канца дзён перажываў за яе. Вельмі шмат рабіў для беларусізацыі ў Сібіры".

Апошні прытулак Альберт Мітэр знайшоў на могілках Акадэмгарадка ў Новасібірску.

*Управа МГА*
*"ЗБС "Бацькаўшчына"*

# Аркадзь Пінчук (1930–2008)

11 сакавіка памёр сябра ЗБС "Бацькаўшчына" ў Санкт-Пецярбурзе, ваенны журналіст і пісьменнік Аркадзь Пінчук.

Аркадзь Пінчук нарадзіўся 11 студзеня 1930 г. у вёсцы Васілевічы, што на Гомельшчыне. Пасля вызвалення Беларусі паступіў у пяхотнае вучылішча, а ў 1984 г. палкоўнікам звольніўся ў запас. Шлях у журналістыку пачаўся з допісаў (над якімі ён працаваў будучы камандзірам кулямётнага ўзвода) і аматарскіх фатаграфій. Актыўнасць і прынцыповасць палкавога ваенкара прывялі да таго, што камандаванне накіравала яго вучыцца на курсы журналістыкі ў Львоўскае ваенна-палітычнае вучылішча. Пасля працаваў у газеце Прыкарпацкай ваеннай акругі, пераход у агульнавайсковую газету "Чырвоная зорка" быў адзнакай кар'ернага росту. Ён быў сапраўдны газетны, а пазней і літаратурны працаўнік, які жыў па прынцыпе "ні дня без радка!". А працаваў ён найперш для людзей у пагонах; добра разумеў і любіў тых, для каго армія стала справай усяго жыцця.

Калі служыў у Беларусі, у 1969 г. стаў сябрам Саюза пісьменнікаў — рэкамендацыі далі Анатоль Дзялендзік і Андрэй Макаёнак. Тады ж, пры падтрымцы Івана Шамякіна ў Мінску на беларускай мове выйшла кніга "Многа-мала", была пастаўлена аднайменная радыёп'еса. У 1977 г. А. Пінчук стаў начальнікам карпункта армейскай газеты ў Ленінградзе. Так тут і застаўся, хоць штогод наведваў Беларусь — наязджаў да сястры ў Васілевічы. У 1990-я А. Пінчук стварыў Міжнародную асацыяцыю пісьменнікаў-баталістаў і марыністаў Пецярбурга (увайшлі 86 чалавек), арганізаваў выданне серыі "Не дзеля славы", ладзіў канферэнцыі ў гонар вядомых военачальнікаў. 11 студзеня 2005 г. пісьменнік адзначыў 75-годдзе, напярэдадні юбілею выйшла яго займальная аўтабіяграфічная кніга "Белы бусел ляціць". Атрымаў некалькі літаратурных узнагарод, у тым ліку ў 2006 г. Дзяржаўную прэмію Расіі імя Г.К. Жукава. У 2005 г. ён стаў лаўрэатам самага прэстыжнага ў Санкт-Пецярбурзе прафесійнага конкурсу журналістаў "Залатое пяро".

Пахаваны А. Пінчук на сямейнай дзялянцы на Сестрарэцкіх могілках. Побач – пустая магіла з капсулай зямлі з брацкіх могілак у Волагдзе, дзе быў расстраляны падчас сталінскіх рэпрэсій бацька, побач – магіла маці, якую ён прывёз з вёскі Васілевічы і даглядаў, пакуль яна ў 102 гады не пакінула гэты свет... Да апошняга дня ён захоўваў востры розум, вобразнасць мыслення і бойкае пяро. Пранікнёна выступаў у 2007 г. на сходзе беларусаў Пецярбурга ў "Ленспецсму" – заклікаў землякоў да памяркоўнасці.

Пісаў ад душы, з талентам, пра які кажуць, што гэта ад Бога.

*Сяргей Марцінкевіч,*
*Мікола Нікалаеў*

**Управа ЗБС "Бацькаўшчына" выказвае спачуванні сем'ям, сябрам і калегам слынных беларусаў.**

# ДЖОЗЭФ СОЛМАН

Джозэф Солман, які разам з Маркам Ратко і іншымі мадэрністамі спрыяў рэфармаванню амерыканскага мастацтва яшчэ ў 30-х гадах мінулага стагоддзя, памёр у сваёй студыі на Манхэтане.

Дж. Солман нарадзіўся ў 1909г. у Віцебску. Пазней яго сям'я перабралася ў ЗША і пасялілася ў Квінсе. Солман наведваў заняткі ў Лізе студэнтаў, а таксама вучыўся ў Нацыянальнай мастацкай акадэміі. У 1935 г., ужо вядомы майстра, Солман стварыў групу прагрэсіўных экспрэсіяністаў "Дзесяць", у якую ўваходзілі такія сусветна вядомыя творцы, як Марк Ратко, Адольф Готліў і Ілля Балатоўскі. Прыкладна ў гэты ж час Солман быў абраны галоўным рэдактарам часопіса Art Front.

*Паводле "Нашай Нівы"*

# Аляксею Марачкіну зноў пагражае адміністрацыйная адказнасць



Вядомаму мастаку, старшыні "Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" Аляксею Марачкіну пагражае адміністрацыйная адказнасць за карціну, напісаную 11 гадоў таму. Карціна намалявана ў шаржаванай манеры і нават у тыя гады выстаўлялася ў Палацы мастацтваў. Палатно прадстаўляе 10 асобаў з тагачанага кіраўніцтва. Зараз гаворка вядзецца наконт знявагі вышэйшай асобы ў краіне.

А. Марачкін распавядае: "Карціна створана ў 1997 г. На ёй 10 персонаў, падобных да тагачаснага кіраўніцтва. Некаторых ужо няма. Некаторыя зніклі, некаторыя збеглі. Гэта нешта такое ў традыцыі беларускай батлейкі. Карціна паўстала ў той час, калі была актуальная тэлеперадача "Куклы" па НТБ. Карціна паказвалася публічна, друкавалася ў газетах. Амаль праз 12 гадоў праца спатрэбілася, каб раскруціць справу".

Напярэдадні Дня Волі ў майстэрню да мастака прыйшлі міліцыянты. Яны канфіскавалі плакаты, прымеркаваныя да шэсця, а таксама забралі карціну "Ляялькі". Пасля таго інцыдэнту Аляксея Антонавіча кінулі "на суткі" — нібыта за нецэнзурную лаянку.

І вось днямі А. Марачкін быў выкліканы ў Цэнтральны РУУС Мінска, дзе даведаўся, што супраць яго ўзуджана адміністрацыйная справа: "Допыт праводзіў старшы лейтэнант Д.П. Курыльчык, — гаворыць А. Марачкін. — Яны сфатаграфавалі ўсе канфіскаваныя напярэдадні Дня Волі расцяжкі, а таксама карціну "Лялькі", на якой, паводле міліцэйскага пратаколу, "изображено 10 мужских фигур". У сваю чаргу я распавёў, што рыхтаваў плакаты да дазволенага ўладамі шэсця. Але, што самае дзіўнае, міліцыянты падчасператрусу канфіскавалі і расцяжкі ранейшых гадоў — з маёй асабістай калекцыі, якія да сённяшняга Дня Волі не прызначаліся. У міліцыі мне сказалі, што ў хуткім часе распачнецца экспертыза канфіскаваных плакатаў і "Лялек". Ці то ў жарт, ці то ўсур'ёз мне паведамілі, што экспертыза будзе праводзіцца ў будынку РУУС. Я параіў міліцыянтам прыцягнуць для правядзення экспертызы прафесійных мастакоў. На што мне было сказана: "Нікога з вашага саюза мы браць не будзем, у нас свае спецыялісты ёсць". І ў выпадку, калі экспертыза выявіць, што галоўны герой карціны падобны на самага высокага беларускага начальніка, мяне, магчыма, абвінавацяць у знявазе".

Сам мастак каментуе сітуацыю наступным чынам: "Гэта смех на ўвесь свет! Прыцягваць да адказнасці за карціну, якая выстаўлялася ў Палацы мастацтва – гэта проста абсурдна. Выява гэтай карціны друкавалася ў многіх газетах і раней нараканняў ні ў кога не выклікала, а вось зараз вырашылі прычапіцца менавіта да яе..."

Каментуючы падзею, юрыст і праваабаронца Уладзімір Лабковіч прыгадвае, што ў сучаснай беларускай гісторыі гэта не першае падобнае здарэнне: "Быў бы чалавек – справа знойдзецца... На жаль, не ўпершыню ў нашай краіне адбываюцца падобныя справы. Ужо шмат за якія літаратурныя творы ўзбуджаліся крымінальныя справы. Гэта тычыцца справы і Алеся Адамовіча ў 1997 г., гэта тычыцца літаратурнага твору, за які адбываў пакаранне Андрэй Клімаў зусім нядаўна. На жаль, гэта паказвае дзікі стан нашай краіны. Безумоўна, гэтая карціна – творчая праца знакамітага і вядомага беларускага мастака. Мне самому сорамна за нашую міліцыю, якая ініцыюе такія крымінальныя праследы. Усё гэта прыгадвае пачатак XX ст., калі ў Савецкім Саюзе і Нямеччыне творцы за сваю пазіцыю, выказаную ў сваіх працах, праходзілі праз рэпрэсіі. Таму з чалавечага пункта гледжання проста крыўдна.

Міліцыя ўжо паінфармавала мастака аб намеры знішчэння карціны, а таксама 23 беларускамоўных плакатаў і эмблемаў з нагоды юбілею БНР, падрыхтаваных на дазволены мітынг".

А. Марачкін мае намер звярнуцца з адкрытым лістом да генеральнага пракурора Беларусі, а таксама выступіць са зваротам да беларускага грамадства.

*Паводле "Народнай волі", "Польскага радыё для замежжа"*

## АЛЯКСЕЙ МАРАЧКІН АДНАВІЎ ВОБРАЗ МАЦІ БОЖАЙ КУРАПАЦКАЙ

Мастак Аляксей Марачкін аднавіў абраз Маці Божай Курапацкай на каплічцы ў Курапацкім лесе. 20 траўня ўвечары Аляксей Марачкін прыехаў у Курапацкі лес разам з сынам Ігарам. Яны знялі дошку з капліцкі, да якой быў прымацаваны пашкоджаны вандаламі абраз маці Божай Курапацкай і на яе месца прымацавалі новую рэпрадукцыю. Спадар Марачкін сказаў, што забірае пашкоджаную выяву абраза для музею вандалізму. Арыгінал абраза Маці Божай Курапацкай усіх нявінна расстраляных, напісаны мастаком каля пяці гадоў таму, знаходзіцца ў Чырвоным касцёле. Рэстаўрацыяй рэпрадукцыі абраза на капліцы ў Курапацкім лесе спадар Марачкін займаецца ўжо трэці раз.

"Ужо трэці раз мы займаемся тым, каб нeяк аднавіць гэтую капліцку. Тое, што зрабілі вандалы, гэта, канечне, настолькі ўражвае! І мы думаем з маім сынам Ігарам зрабіць плакат, якраз прысвечаны Курапатам".

*Паводле "Радыё Свабода"*

## ВІНШАВАННІ СЯБРАМ ВЯЛІКАЙ РАДЫ

Маем гонар павіншаваць з Днём нараджэння сябраў Вялікай Рады "Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", якія нарадзіліся ў чэрвені: Валянціна Голубева, Аляксея Глушко (Беларусь), Яўгена Вапу (Польшча), Валерыя Барташа (Украіна). Прыміце ад нас шчырыя пажаданні шчасця, доўгага жыцця, выдатнага здароўя, натхнёнай працы, духоўнай і творчай самарэалізацыі!



*Управа МГА*
*"ЗБС "Бацькаўшчына"*

## ЛЕАНІД ПІТАЛЕНКА СВЯТКУЕ 65-ГОДДЗЕ

Л. Піталенка, старшыня Нацыянальнага культурнага цэнтра "Беларусь" (г. Алмааты, Казахстан), сябра Вялкай Рады ЗБС "Бацькаўшчына" 18 чэрвеня святкуе 65-годдзе.

У 2007 г. ён увайшоў у лік дзевяці дэпутатаў мажыліса парламента ад Асамблеі народу Казахстана. Падчас тайнага галасавання за Л.Піталенку свае галасы аддалі 314 чалавек.

Ад імя ЗБС "Бацькаўшчына" віншуем сп. Леаніда з юбілеем. Зычым здароўя, душэўных сіл, поспехаў у новых пачынаннях і нязгаснага аптымізму.

*Управа МГА*
*"ЗБС "Бацькаўшчына"*

## 50-ГОДДЗЕ "БЕЛАВЕЖЫ"

28-29 чэрвеня Беларускае літаратурнае аб'яднанне "Белавежа" святкуе сваё 50-годдзе. Аб'яднанне згуртавала вакол сябе творчых беларусаў Польшчы ў 1958 годзе. За паўвекавы перыяд дзейнасці было шмат зроблена і шмат выдадзена кніг, шмат каму аб'яднанне дапамагло ў самарэалізацыі. Старшыня аб'яднання - Ян Чыквін.

Віншуем "белавежцаў" і зычым далейшых творчых поспехаў.

*Управа МГА*
*"ЗБС "Бацькаўшчына"*

ПОСТАЦЬ

## ЯГОНАЯ МІЛАСЦЬ ЕПІСКАП НАВАГРАДСКІ І ПАЎНОЧНА-АМЕРЫКАНСКІ СВЯТАСЛАЎ, АДМІНІСТРАТАР БАПЦ

У міры — Вячаслаў Вячаслававіч Логін, нарадзіўся 26 лістапада 1964 г. у Чарнігаве (Украіна) у сям'і інжынераў Вячаслава і Людмілы (Сіз).

(Род паходзіць з Наваградчыны, дзед Андрэй Логін і ягоны брат Язэп (расстраляны ў 1930-я гг.) былі беларускімі фальклярыстамі. Дзед па лініі маці — Даніла Сіз у 1930-я г.г. скончыў Гомельскі чыгуначны тэхнікум.)

У 1986 г. скончыў кіеўскі Політэхнічны інстытут, працаваў інжынерам.

У 1994-1999 гг. навучаўся ў Кіеўскай духоўнай семінарыі, пасля сканчэння яе, у 1999-2000 гг. навучаўся на Тэалагічным факультэце Манітобскага ўніверсітэта (Праваслаўны калегіўм Св. Ап. Андрэя ў Вініпэгу, Канада).

27 жнівеня 2000 г. рукапакладзены ў сан дыякана, а 17 снежня 2000 г. — у святара ў Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царкве Св. Кірылы Тураўскага ў г. Таронта (правінцыя Антарыё, Канада) і прызначаны на гэтую ж Парафію.

У 2002-2007 гг. служыў настаяцелем Парафіі Св. Жыровіцкай Іконы Божае Маці БАПЦ у г. Гайлянд Парк (штат Нью-Джэрсі, ЗША).

У 2005-2006 гг. выконваў абавязкі настаяцеля Катэдры Св. Кірылы Тураўскага БАПЦ у Нью-Ёрку (ЗША).

З 2007 г. — настаяцель Парафіі Св. Кірылы Тураўскага ў Таронта. У кастрычніку 2006 г. Царкоўнай Радай БАПЦ аднагалосна абраны кандыдатам у епіскапы.

У лютым 2008 г. прымае манашы пострыг з імем Святаслаў у манастыры Св. Чатырох Евангелістаў (УАПЦ у ЗША) у Х'юстане (штат Тэхас, ЗША) 24 лютага 2008 г. у Катэдры Св. Ап. Андрэя Першазванага ў Дэтройце (штат Мічыган, ЗША) архіепіскапам Аляксандрам (УАПЦ у ЗША) узведзены ў сан ігумена і архімандрыта.

11 траўня 2008 г. ерархамі Украінскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў ЗША (радавод хіратоній якой ідзе ад УАПЦ у часы 2-й сусветнай вайны) — арх. Аляксандрам і еп. Макарыясам, з удзелам еп. Паісія (УПЦ Кіеўскі Патрыярхат) хіратанізаваны на епіскапа Наваградскага і Паўночна-Амерыканскага БАПЦ за Боскаю Літургіяй на парафіяльнае свята ў Кафедральным Саборы Св. Кірылы Тураўскага БАПЦ у Нью-Ёрку (ЗША), і Царкоўнай Радай БАПЦ абраны Адміністратарам Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы.

## БЕЛАРУСКІ КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТ НА ЧЭРВЕНЬ 2008 Г.

1 чэрвеня – 90 гадоў таму, у 1918 г. у Мінску адкрылася кансерваторыя.

4 чэрвеня – 90 гадоў таму, у 1918 г. апублікавана "Беларуская граматыка для школ" Б. Тарашкевіча.

7 чэрвеня – 100 гадоў таму, у 1908 г. нарадзіўся Уладзімір Галубовіч, беларускі і польскі археолаг.

7 чэрвеня – 445 гадоў таму, у 1563 Жыгімонт II Аўгуст выдаў Віленскі прывілей, які ўраўнаваў у правах праваслаўных і каталікоў у Вялікім княстве Літоўскім.

9 чэрвеня – 140 гадоў таму, у 1868 г. нарадзіўся Уладзіслаў Вярыга, філосаф, этнограф, збіральнік беларускага фальклору.

14 чэрвеня – 70 гадоў таму, у 1938 г. заснаваны Беларускі дзяржаўны тэатр лялек.

14 чэрвеня – 105 гадоў таму, у 1903 г. памёр Ян Карловіч, беларускі лінгвіст, этнограф, фальклярыст, музыказнаўца.

17 чэрвеня – 215 гадоў таму, у 1793 г. у Гародні пачаўся апошні Сойм Рэчы Паспалітай.

22 чэрвеня – 5 гадоў таму, у 2003 г. памёр Васіль Быкаў, беларускі пісьменнік.

27 чэрвеня – 145 гадоў таму, у 1863 г. памёр Зігмунт Серакоўскі, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863-1864 гадоў.

1 ліпеня – 180 гадоў таму, у 1828 г. нарадзіўся Іпаліт Гараўскі, беларускі мастак-пейзажыст.

1 ліпеня – 105 гадоў таму, у 1913 г. у Вільні закладзена Беларускае выдавецкае таварыства.

8 ліпеня – 15 гадоў таму, у 1993 г. адбыўся І з'езд беларусаў свету.

# “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ” ЗНІКНЕ СА ШКОЛЬНАЙ ПРАГРАМЫ?

*Працяг. Пачатак на стар. 1*

тых 9-10 класаў, якія знаходзяцца цяпер у школе і будуць у такім экстрэмальным рэжыме заканчваць школу, нават у іх напісана: гісторыя – 2 гадзіны”.

Настаўніца гісторыі мінскай гімназіі №12 Вольга Шаўцова пра мяркуемыя змены ведае. Кажа, што нібыта нават існуе адмысловы падручнік для новага прадмета. Праўда рыхтаваўся ён пад 12-годку: “Я пра гэта чула, я ведаю, што ёсць падручнікі, іх ужо падрыхтавалі. І там гісторыя ідзе як інтэграцыйны курс. Гэта значыць, што ў адным падручніку паслядоўна будзе выкладацца гісторыя сусветная… і гісторыя Беларусі, калі гэтыя працэсы ахопліваюць нашу тэрыторыю. Падручнік будзе адзін, але ён быў падрыхтаваны для 12-гадовай школы. Што будзе цяпер з пачатку верасня, я не ведаю”.

В. Шаўцова расказвае, што з настаўнікамі гісторыі наконт аб’яднання двух прадметаў ніхто не раіўся. Але, магчыма, гэта і добрая ідэя, калі б толькі рабілася трошкі па-іншаму — настаўнікі былі супраць выкладання гісторыі роднай краіны па-руску: “У нас не пыталіся пра тое, ці трэба аб’ядноўваць гэтыя курсы. Тым не менш многія былі згодныя, але не ў такім ракурсе. Мы, напрыклад, былі супраць таго, каб гісторыя Беларусі выкладалася на рускай мове. Настаўнікі гісторыі ўсё ж такі выступаюць за тое, каб гісторыя Беларусі выкладалася на роднай мове”.

Незразумела, чаму і каму ўсё ж такі спатрэбілася аб’яднаць “Сусветную гісторыю” з “Гісторыяй Беларусі”. Настаўнікі і надалей маглі выкладаць гісторыю нашай краіны “комплексна”. Як тое рабіла В. Шаўцова. Без агульнага падручніка: “Наогул, гэта такі культурна-цывілізацыйны падыход. З гэтага пункта гледжання, тое абсалютна правільна. Я, напрыклад, у любым выпадку працую сінхронна, хоць і не па інтэграцыйным падручніку. Я даю курс “сусветкі” і пасля разглядаю, якія працэсы адбываліся ў Беларусі і як гісторыя сусветная паўплывала на адпаведныя працэсы ў нашай краіне”.

Вядомы пісьменнік і гісторык Уладзімір Арлоў называе такі крок спробай ператварыць нашу гісторыю з тысячагадовай у вельмі кароткую. Не выключае ён і таго, што чыноўнікі пойдуць на скарачэнне гадзінаў, адведзеных на гісторыю Беларусі: “Гістарычная памяць – вялікая стваральная сіла, і гэта выдатна разумее любая ўлада. Ну, а наша ўлада гэтай сілы папросту баіцца. Мы ўжо не першы год назіраем спробы ператварыць нашу гісторыю з тысячагадовай ў гісторыю вельмі кароткую, якая пачынаецца, можа, толькі ў XX стагоддзі. Гэта чарговы крок. Мы з’яўляемся сведкамі рэдагавання гісторыі, якую падпарадкоўваюць ідэалагічным нормам. Не выключана, што будуць скарачаць гадзіны…”

Аб’яднанне “Гісторыі Беларусі” з “Сусветнай гісторыі” – з’ява не новая. Гэты крок вяртае нас у савецкія часы. Калі існаваў толькі адзін прадмет “Гісторыя”, і выкладаўся ён па-руску.

*Паводле “Еўрапейскага радыё для замежжа”*

# ПЕРАМОЖЦА КОНКУРСУ “АДЗІН ДЗЕНЬ У БНР”




Мінулай восенню “Радыё Свабода” абвясціла літаратурны конкурс “Адзін дзень у БНР-2008”. Умовай конкурсу было стварэнне тэксту адвольнага жанру, які б апісваў жыццё ў Беларускай Народнай Рэспубліцы ў часы адзначэння яе 90-годдзя.

Іншымі словамі, аўтар павінен быў прыдумаць рэаліі БНР, якая ў 1918 г. перамагла, адбылася і рыхтуецца адзначыць 90-годдзе сваёй незалежнасці. Па электроннай і звычайнай пошце было атрымана некалькі дзесяткаў твораў самых розных жанраў – аповесці, апавяданні, эсэ, вершы, паэмы, рэпартажы і прыватныя лісты.

Прафесійнае журы ў складзе Уладзіміра Арлова, Уладзіміра Някляева, Алеся Пашкевіча, Сяргея Шупы і Захара Шыбекі напярэдадні 25 сакавіка вызначыла 12 фіналістаў і прапанавала слухачам выказаць сваю думку аб творах, выстаўленых на сайце “Радыё Свабода” ў інтэрнэце.

Сябры журы асноўным крытэрыем называюць пранікненне аўтараў у прыдуманую імі, але патэнцыйна магчымую рэчаіснасць БНР праз 90 гадоў яе існавання.

І вось імёны пераможцаў конкурсу. Трэцяе месца журы аддало Кастусю Сырэлю за апавяданне “Малыш”. Другое месца заняў аўтар пад псеўданімам “Пяты” за апавяданне “Крылаты вершнік”. А пераможцам нашага конкурсу стаў празаік з Гомеля Сяргей Балахонаў за аповесць-комікс “Пятля зацятасці”. Усе фіналісты будуць узнагароджаны лічбавымі радыёпрыёмнікамі, а пераможца, Сяргей Балахонаў, атрымае ў падарунак фотаапарат “Кэнан”.

Творы фіналістаў больш за месяц былі выстаўленыя ў інтэрнэце, людзі галасавалі, таму журы вырашыла назваць і ўладальніка прыза чытацкіх сімпатыяў – ім стаў Алесь Чайчыц з апавяданнем “Трынаццаты пастарунак”.

*Паводле “Радыё Свабода”*

НАВІНЫ

## СТАКГОЛЬМ (ШВЕЦЫЯ)

**Швецыя працягне падтрымку грамадзянскай супольнасці ў Беларусі.** Працяг падтрымкі грамадзянскай супольнасці і незалежных СМІ ў Беларусі стане адным з прыярытэтаў новага старшыні ў Савеце Еўропы – Швецыі. Нагадаем, гэтая краіна ўзначаліла галоўны распарадчы орган Савета Еўропы – Кабінет міністраў – 7 траўня. “Дэмакратычнае развіццё Беларусі турбуе Еўропу, – адзначаецца ў дакуменце, размешчаным на афіцыйным сайце СЕ. – Беларусь можа стаць сябрам Савета Еўропы, як толькі будзе гатовая выканаць усе неабходныя для сяброўства ўмовы і абавязацельствы”. Таксама адзначаецца, што Швецыя будзе садзейнічаць супрацоўніцтву Беларусі і Савета Еўропы.

*Паводле БелаПАН*

## ПАЛІТЫКА

*Паводле "Радыё Свабода", "Еўрапейскага радыё для Беларусі", "Салідарнасці", АФН*

* Новым старшынёй грамадскага аб'яднання "Беларускі Хельсінскі камітэт" (БХК) абраны Алег Гулак (раней ён выконваў абавязкі кіраўніка арганізацыі).

* 23 траўня ў судзе Цэнтральнага раёна Мінска пачнецца суд над Паўлам Вінаградавым, Міхасём Субачам і непаўналетнім Максімам Дашуком, якія праходзяць па "справе чатырнаццаці".

* На 15 сутак адміністрацыйнага арышту асуджаны журналіст, сябра Рады СБП, аўтар кнігі "Кроў і попел Дражна" Віктар Хурсік. Такое рашэнне прыняў суд Старых Дарог. Ён палічыў, што Хурсік удзельнічаў ва ўсталяванні крыжа каля вёскі Дражна ў памяць ахвяраў савецкіх партызанаў.

* Працягваецца пагаршэнне дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і ЗША. У Беларусі засталося працаваць 5 амерыканскіх дыпламатаў.

* Па ўсёй краіне зачыняюцца ў бібліятэках "Амерыканскія куткі".

* Суд Першамайскага раёна г. Мінска арыштаваў палітыка Міколу Статкевіча на 10 сутак. Яго абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі 1 траўня.

* На 700 тыс. рублёў аштрафавалі ў Салігорску лідэра руху "За Свабоду" Аляксандра Мілінкевіча за несакцыянаваны сход, на які сабралася каля паўсотні чалавек.

* Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю агенству "Reuters" 13 траўня сказаў, што будзе балатавацца на наступны прэзідэнцкі тэрмін.

## ЭКАНОМІКА

*Паводле "Польскага радыё для замежжа", АФН, "Беларускіх навін"*

* 15 траўня зноў змяняюцца правілы перамяшчэння праз дзяржаўную мяжу тавараў для асабістага карыстання. Усе тавары, якія вязуць на Беларусь фізічныя асобы, будуць строга кантраляваца. Цяпер будзе дазволена раз на два месяцы правесці не больш за 3 адзінкі аднаго наймення тавараў, але не больш за 10 найменняў. Адзін раз на месяц – 3 адзінкі аднаго віду, але не больш за 3 найменні. У выпадку паездак грамадзян часцей за адзін раз на тыдзень можна будзе правозіць толькі 1 адзінку і толькі 1 найменне тавару. Пры гэтым дапускаецца правезці толькі 1 адзінку не больш за 3 найменні побытавай тэхнікі і прадметаў доўгатэрміновага карыстання з артыкулаў верхняга адзення, абутку і г.д.

* 15 траўня ўлады ЗША аб'явілі аб эканамічных санкцыях супраць трох беларускіх прадпрыемстваў – "Беларускі нафтавы гандлёвы дом", "Лакафарба" і "Шкловалакно".

* Беларусь у першым квартале бягучага года здзяйсняла экспартна-імпартныя аперацыі са 162 краінамі свету. Тавары пастаўляліся на рынкі 112 дзяржаў, імпартавалася прадукцыя 146 краін. Асноўнымі гандлёвымі партнёрамі Беларусі ў студзені-сакавіку з'яўляліся Расія (49,4% ад агульнага тавараабароту), Нідэрланды (10,3%), Украіна (7,2%), Нямеччына (4,7%), Польшча (3,2%), Вялікабрытанія (2,9%), Латвія (2,5%), Кітай (2%), Бразілія (1,4%), Італія і Літва (па 1,3%).

* Аб'ём валавага ўнутраннага прадукту ў Беларусі ў студзені-красавіку 2008 г. склаў у бягучых коштах Br 34408,9 млрд. рублёў і павялічыўся ў параўнанні з такім жа перыядам 2007 г. на 10,4%.

* 14 траўня Палата прадстаўнікоў парламента РБ на пленарным пасяджэнні прыняла законапраект "Аб іпатэцы".

* Аршанскі льнокамбінат распрацаваў тэхналогію выпуску ўласнай джынсавай тканіны. Класічная джынсавая тканіна – гэта 100-працэнтная бавоўна. Беларуская ж тканіна складаецца з 48% бавоўны і 52% ільну. Яе выпуск пачнецца напрыканцы траўня.

* Інфляцыя за красавік ў 1,5 разы перавышае сакавіцкія паказальнікі. Так, у красавіку гэты паказальнік склаў 1,2% супраць 0,8% у сакавіку і 0,7% у лютым. У студзені кошты павялічыліся на 2,5%.

* Беларусь з 6 траўня пачала пастаўляць электраэнэргію ад Бярозаўскай ГРЭС у Польшчу.

## КУЛЬТУРА

*Паводле"Замежнага радыё для Беларусі", "Радыё Свабода"*

* У рамках ушанавання памяці князя Канстанціна Астрожскага пасля правядзення літургіі 10 траўня ў вёсцы Тарасава пад Мінскам была ўрачыста адкрыта памятная дошка ў яго гонар.

* Расійскі бок перадаў 345 дакументаў, якія тычацца сакрэтных і няўдалых аперацый 1943 г., калі савецкія войскі беспаспяхова спрабавалі 11 разоў вызваліць тэрыторыю Віцебскай вобласці ад гітлераўцаў.

* Адбываецца зноўку рэформа адукацыі: 12-гадовае навучанне замяняецца на 11-гадовае.

## РОЗНАЕ

*Паводле інфармацыі "Хартыі-97", "Нашай Нівы"*

І нягледзячы на добрыя эканамічныя паказальнікі ў Беларусі, па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, наша краіна разам з Расіяй, Украіна, Эстоніяй і Літвой уваходзіць у пяцёрку краінаў з самым высокім узроўнем самагубстваў. Беларусь таксама за апошнія 10 гадоў выйшла ў сусветныя лідэры па ўзроўні злачыннасці. Колькасць забойстваў на 100 тыс. насельніцтва ў Беларусі ў 8 разоў вышэйшая, чым у Польшчы, у 2 разы вышэйшая, чым ва Украіне. Такое ж сумнае лідэрства ў Еўропе належыць нашай краіне па колькасці знікненняў людзей.

Беларусь з'яўляецца таксама не самай міралюбнай краінай у штогадовым "Рэйтынгу міралюбнасці краінаў свету", якое праводзілася незалежным даследчым Інстытутам эканомікі і міру і аналітычным аддзелам брытанскага часопіса "The Economist". Даследаванне ўключае адзнаку па 24 крытэрах, якія тычацца знешняй палітыкі і ўнутранай сітуацыі ў краінах, аб адносінах з суседнімі краінамі, продажах зброі і колькасці ўзброеных сілаў, размешчаных за мяжой. А таксама пагрозы тэрарыстычнага нападу, узроўню злачыннасці і колькасці зняволеных у краіне. Беларусь у гэтым спісе займае 94 месца і суседнічае з Камбоджы, Мексікай і Папуа Новай Гвінеяй. Найменш мірнымі прызнаныя Аўганістан (137), Судан (138) і Самалі (139).

Губляе Беларусь і сяброўства са сваім усходнім суседам. Згодна з апытаннем, зладжаным Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі, у 2008 годзе найбольш сяброўскія адносіны ў Расіі на сёння скláліся з Кітаем. На другім месцы апынулася Нямеччына. Ворагамі № 1 у рускіх на сёння — ЗША і Грузія (так мяркуюць па 25% апытаных), на трэцяе месца патрапіла Украіна (21%). У апанентах у Расіі ходзяць Вялікабрытанія, Польшча, краіны Балтыі ды іншыя дзяржавы. Беларусь у спісе ворагаў на 12-м месцы.

Варта адзначыць, што паводле праведзенага ў 2006 г. расійскім "Левада-Цэнтрам" штогадовага апытання, Беларусі сімпатызавалі 47%. На другім месцы тады быў Казахстан — 33%, а сёлетні фаварыт — Кітай — меў 24% галасоў і знаходзіўся на трэцім месцы. Тройку ворагаў Расіі складалі Латвія, Грузія і Літва — 46%, 44 і 42% адпаведна.

## "ТАРЗАН" ПА-БЕЛАРУСКУ НА DVD

Выйшаў у свет дзіцячы мультфільм "Тарзан", дубляваны на беларускую мову. Адметнасць беларускага "Тарзана" ў тым, што песні на ангельскай мове пераспяваў па-беларуску Зміцер Вайцюшкевіч. Кіраўнік праекту Алесь Квіткевіч падкрэслівае, што "Тарзан" па-беларуску – першы з запланаванай серыі. Праект створаны супольна творчым згуртаваннем "Дзіўноты і памароцтвы" ды фірмай "Сотвар". У ранейшыя гады ў серыі ўжо выходзілі дубляваныя на беларускую мову ўсясветныя хіты дзіцячай анімацыі: "Русалачка", "Аліса ў краіне цудаў", "Прыгоды Віні-Пыха" ды іншыя. Але стужкі выдаваліся на касетах. Далей Алесь Квіткевіч: "Мы вырашылі да кожнага старога мультфільму, які быў у свой час агучаны на беларускую мову, дадаць па адным новым і перавыдаць усё гэта на якасных лічбавых носьбітах".

Пра бліжэйшыя планы: "Наступныя будуць "Карпарацыя монстраў" плюс "Шрэк-1" на адным дыску, а потым будуць "Самаходзікі" плюс "Гісторыя цацак".

*Паводле "Радыё Свабода"*

## "ГАВАРЫ СА МНОЙ ПА-БЕЛАРУСКУ"

У красавіку 2008 года з друку выйшаў навучальны дапаможнік "Гавары са мной па-беларуску". Гэта кніга – выданне рукапісу, які размешчаны ў Інтэрнэце па адрасах: http://knihi.com/www/padrucnik і http://padrucnik.by.ru/. Аднак у працэсе падрыхтоўкі да друку работа была істотна выпраўлена, дапоўнена і дапрацавана, таму кніга значна адрозніваецца ад рукапісу. Кніга "Гавары са мной па-беларуску" ёсць адным з першых навучальных дапаможнікаў па класічнай (тарашкевіца) беларускай мове, калі не браць на ўлік перавыданняў падручнікаў пачатку XX стагоддзя. Кніга прызначаецца для шырокага кола чытачоў. Яе можна не толькі чытаць як мастацкую літаратуру, але і паспяхова выкарыстоўваць на занятках па беларускай мове ў інстытуце, школе, дзіцячым садку. Гэтая кніга для тых, хто цікавіцца беларускаю мовай, спрыяе ёй і хоча вывучаць самастойна.

*Паводле сайта http://padrucnik.by.ru*

## ГАСТРОЛІ ГУРТУ "СТАРЫ ОЛЬСА"

6 чэрвеня плануе адбыцца канцэрт гурту ў г. Прага (Чэхія), а 19 гадзіне, Клуб "Vagon". Кантактная асоба: Алесь Судлянкоў, +420 776 234 090.

7-8 чэрвеня выступ падчас Фэсту "Zycie Codzienne we Wczesnosredniowiecznym Radomiu" ў г. Радом (Польшча).

22 чэрвеня выступ падчас Фэсту "Краіна Мрій" у г. Кіеў (Украіна).

5-6 ліпеня адбудзецца X міжнародны фестываль "Дні жывой археалогіі" ў г. Кернава (Літва) – запланаваны выступ гутру. Кантактная асоба: Juste Bliujute, +370 611 447 72.

*Паводле сайта "Стары Ольса"*

## UPS І DHL БОЛЬШ НЕ ВОЗЯЦЬ ПОШТУ ПА БЕЛАРУСІ

Міжнародныя кампаніі UPS, FedEX, TNT і DHL не з'яўляюцца паштовымі перавозчыкамі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Такая абвестка з'явілася ў Нацыянальным аэрапорце "Мінск".

Першым праблему атрымання пасылак праз кампаніі UPS, FedEX, TNT і DHL падняў у сваім блогу беларускі драматург Мікалай Халезін. "Сусветныя сеткі паштовых службаў зусім недаступныя беларускім спажыўцам. Гэта ставіць нас ва ўмовы, калі краіна становіцца абсалютным ізгоем нават у такім пытанні, як паштовыя перасылкі. І нават калі чалавек перасылае нам з-за мяжы праз нейкую з сетак пасылку і аплочвае павышаны тарыф, гэта ўсё роўна не значыць, што мы атрымаем яе ў рукі. Яму прыйдзецца ехаць за 30 кіламетраў ад Мінска ў аэрапорт, каб растаможваць сваю сціплую сямейную пасылку ў адной чарзе з людзьмі, якія растаможваюць эшалоны тавару. Гэта прымушае людзей адмаўляцца ад атрымання гэтых пасылак. На сёняшні дзень колькасць "адмоўнікаў" перавышае 70 адсоткаў. Я гэта звязваю з тым, што беларускі ўрад не хоча пускаць на рынак канкурэнтаў і хоча мець татальны кантроль над рэчамі, што перасылаюцца", – паведаміў прэс-цэнтру "Хартыі-97" Мікалай Халезін.

*Паводле "Хартыі-97"*

IN MEMORIAM

## АЙЦЕЦ ВІТАЛЬ БАРАВЫ

8 красавіка на 93-ім годзе жыцця адышоў у лепшы свет старэйшы клірык РПЦ айцец Віталь Баравы. Айцец Віталь беларус, большую частку жыцця правёў у Маскве, шмат зрабіў для царквы і быў адным з дваіх прадстаўнікоў РПЦ на II Ватыканскім саборы.

Віталь Баравы нарадзіўся 18 студзеня 1916 г. у вёсцы Несцераўка Мінскай губерніі ў збяднелай сялянскай сям'і. Пасля заканчэння народнай польскай школы паступіў у чацвёрты клас Віленскай духоўнай семінарыі. У 1936–1939 гг. вучыўся на багаслоўскім факультэце Варшаўскага ўніверсітэта. З сакавіка 1942 г. служыў сакратаром Мінскага архіепіскапа Панцелеймона (Ражноўскага). Цудам пазбегнуў дэпартацыі ў Нямеччыну. Затым вярнуўся да сваякоў у Мінск, дзе 29 кастрычніка 1944 г. адбылася дыяканская, а 1 лістапада – прэсвітарыянская хіратанія айца Віталія. Удзельнічаў у адраджэнні Мінскай духоўнай семінарыі, пазней стаў прафесарам на катэдры царкоўнай гісторыі ў Ленінградскай духоўнай акадэміі. З канца 1950-х перайшоў на працу ў Аддзел знешніх царкоўных зносін Маскоўскага Патрыярхата, шмат год быў прадстаўніком Рускай праваслаўнай царквы ва Усясветным савеце цэркваў, прадстаўляў Маскоўскую Патрыярхію на II Ватыканскім саборы. З моманту заснавання Сінадальнай багаслоўскай камісіі ў 1960 г. стаў яе пастаянным чальцом. У 1973–1978 гг. Віталь Баравы быў настаўнікам патрыяршага Багаяўленскага сабора, з 1984-га стаў пачэсным настаўнікам храма Уваскрашэння Славушчага ў Брусавым завулку.

*Паводле сайтаў "Беларуская Масква" і "News.com"*

**Беларусы ў свеце**
№5 (76), травень 2008

Інфармацыйны бюлетэнь МГА "ЗБС "Бацькаўшчына".
Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі.

Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з думкай рэдакцыі.
Апрацоўка і вёрстка – М. Азаронак
Адказныя за нумар – А. Макоўская, Н. Шыдлоўская

Наклад 250 асобнікаў

Адрас рэдакцыі:
вул. Рэвалюцыйная, 15, г. Мінск
220030, Рэспубліка Беларусь
www.zbsb.org
zbsb@lingvo.minsk.by; zbsb@tut.by

тэл./факс (+375 17) 224-79-35